# Эка-свет 6+



**ПРЫВІТАННЕ!** Я светлячок. Мяне празвалі Праменьчык. Гэта таму, што я свячуся ў цемры. Такой асаблівасцю мяне надзяліла прырода.

А вось чалавеку даводзіцца шмат працаваць, каб здабыць святло.

Табе вядома, што мільёны гадоў таму глыбока-глыбока пад зямлёй утварыліся вугаль, нафта і газ? Дык вось, людзі навучыліся здабываць гэтыя скарбы, каб рабіць з іх энергіі паліва для дамоў, бензін для аўтамабіляў і электрычнасць для святла.

Але для атрымання энергіі вугаль, нафту і газ даводзіцца спальваць.

Ад гэтага з'яўляецца шмат шкоднага дыму. І падземныя скарбы калі-небудзь могуць скончыцца. Таму людзі сталі шукаць новыя спосабы атрымаць неабходную энергію.

Аказалася, такую энергію можна здабыць на паверхні нашай планеты. Напрыклад, сонейка прыходзіць да нас кожную раніцу і свеціць да самай ночы. Цэлы дзень яно дзеліцца з намі сваёй чыстай энергіяй. У ветра так шмат энергіі, што ад яго парываў нават дрэвы часам схіляюцца да самай зямлі. Вада ў рэках цячэ, не спыняючыся, і ляціць з вадаспадаў з велізарнай сілай.

А яшчэ я ведаю шмат цікавага і незвычайнага пра тое, што людзі робяць, каб лямпачкі запальваліся і ад сонца, і ад ветра, і ад таго, што вада цячэ.

Я буду табе пра гэта расказваць.



Сёння я раскажу пра вельмі разумную падлогу, якая ўмее выкарыстоўваць чыстую энергію, каб ствараць электрычнасць і запальваць рознакаляровыя лямпачкі.

# ЧАРО́ЎНАЯ ПАДЛОГА




У вялізным і мітуслівым, як мурашнік, будынку аэрапорта горада Абу-Дабі, сталіцы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, пабудавалі чароўную падлогу-батарэйку.

Калі людзі крочаць па гэтай падлозе, яны сваімі крокамі насамрэч ствараюць сапраўдную электрычнасць! Падлога пад іх нагамі пачынае сама сабой свяціцца. Атрымліваецца цудоўная дарожка, якая свеціцца і ўсіх радуе, бо гэта прыгожа і вельмі незвычайна.

Вось як гэта працуе.

Падлога-батарэйка зроблена з чароўных плітачак-трохвугольнікаў. Калі ты наступаеш на такую плітачку, яна мякка хістаецца пад тваёй нагой, як маленькі-маленькі батут. А яшчэ пад ёй схаваныя сакрэтнае кольца і магніцікі. Калі наступіць на плітачку, кольца закруціцца, як ваўчок! Круць-круць, і з дапамогай магніцікаў атрымаўся кавалачак электрычнасці для схаваных у плітачках каляровых лямпачак! І не трэба для іх браць электрычную энергію больш ніадкуль!

А каб разумець, колькі электрычнасці атрымліваецца ад хады па плітачках, на сцяне, побач з чарадзейнай дарожкай, вісіць вялікі экран. Гледзячы на яго, ты як быццам глядзіш у акно-ілюмінатар самалёта, які ўзлятае над аэрапортам. І чым мацней і весялей людзі тупаюць па плітачках падлогі, тым вышэй на экране паднімаецца прыдуманы самалёт! Цікава і весела!



І, ш-ш-ш… ніхто з людзей у аэрапорце і не здагадваецца, што плітачкі таемна лічаць іх крокі. Яны падказваюць спецыяльным робатам, колькі людзей прайшло па дарожцы, каб у аэрапорце ніхто не згубіўся.

Той, хто патрапіў на чароўную падлогу, не можа ўтрымацца ад усмешкі.

І не толькі дзеці, але нават сур'ёзныя дарослыя!

Вось якую разумную дарожку прыдумалі і стварылі людзі.

Ну вось, пакуль усё.

Да новых сустрэч на старонках нашага часопіса!